# ШЧАСЦЕ ЧАЛАВЕЧАЕ ВЫМЯРАЕЦЦА ІСЦІНАЙ ДОБРАЙ І ВЕЧНАЙ



... Ужо амаль тыдзень Аляксандр знаходзіўся ў дарозе. З кожнай гадзінай у вагоне пасажырскага цягніка, што імчаў на поўдзень краіны, у Ашхабад, станавілася душна і няўтульна. Прынікшы да вагоннага акна, ён вачэй не зводзіў з навакольных пейзажаў, якія, як кадры са стужкі нямога кіно, мільгалі, праносіліся міма. Яму ўсё было цікава, бо ўпершыню апынуўся ў такой далёкай і чужой старане. Закрываў вочы, і ўсплывалі ў памяці краявіды з пералескамі, бярозкамі ды хмызнякамі... Успаміналася ціхая вёсачка на Глыбоччыне з такой дарагой і казачнай назвай Лісіцы. Хоць восень панавала ў дарагіх мясцінах (акурат у апошні кастрычніцкі дзень адпраўляўся з роднага дому ў армію), халодныя вятры пастрасалі апошняе лісце з дрэў, усё ж мілейшым здаваўся голы хмызняк за гэту паўднёвую зеляніну за акном.

Не зважаючы на рытмічны грукат і скрыгатанне вагонных колаў, Аляксандр прыдаваўся ўспамінам пра яшчэ зусім нядаўняе дзяцінства, школьнае юнацтва. Як усё там было проста і зразумела: дапамагаў матулі па гаспадарцы, узімку бегаў з сябрамі на лыжах, удзельнічаў у хакейных баталіях, што ладзіліся на лёдзе самай вялікай лужыны ў ваколіцах вёскі, гуляў у вайну, падчас да самазабыцця, покуль не пакліча маці дадому. Карацей, жылося хораша, прывольна. А жыццё ўсё ўмяшчалася на прасторы Чарневічы-Глыбокае-Полацк. Пасля заканчэння Чарневіцкай школы паступіў вучыцца на электрыка ў Ветрынскае прафтэхвучылішча. І вось, як і ва ўсіх аднагодкаў, – прыйшоў час служыць у арміі.

... Ашхабад сустрэў асляпляльным сонцам, гарачым ветрам з пясчанымі бурамі. І горы... Яны нібы заварожвалі, і не тое, што прыгняталі, а ціснулі на сэрца нейкім незразумелым адчуваннем цяжару. Службу пачынаў у вучэбнай мотастралковай часці, засвойваў азы аператара наводчыка баявой машыны пяхоты.

– Хоць ніхто і не казаў, што нас рыхтуюць для адпраўкі ў Афганістан, – успамінае Аляксандр Шынкевіч. – Ды так яно было на самой справе. У канцы красавіка 1984 года

мы апынуліся на чужыне. Пачалося зусім іншае жыццё: разведка на мясцовасці, засады ў горных цяснінах, выяўленне банд душманаў, суправаджэнне калон, прыкрыццё пяхоты, зачыстка мясцовасці. Гэта была сапраўдная вайна.

У розныя, часта экстрэмальныя, сітуацыі даводзілася трапляць Аляксандру Шынкевічу, падчас балансуючы на мяжы жыцця і смерці. І пасля, асэнсоўваючы перажытае, усведамляў для сябе: чалавеку ў жыцці зусім нямнога трэба: глыток вады, ласкуток ценю пад палаючым сонцам, хвілінку для сну і вестачку з дому. А дамоў, між іншым, пісаў, што ўсё выдатна, маўляў, загараем на сонцы і апельсінчыкі ядзім.

У крайне суровых умовах даводзілася ваяваць. Усяго, як кажуць, давялося паспрабаваць: і чаю з вярблюджых калючак паспытаць, і подых смерці зведаць. Перахварэў жаўтухай і тыфам. Пасля зноў вярнуўся ў строй, асвоіў новыя для сябе салдацкія спецыяльнасці сувязіста і кулямётчыка. У 1985 годзе ў ходзе Панжэрскай аперацыі, падчас выканання баявой задачы, трапіў з сябрамі на міны. Атрымаў сур'ёзнае раненне. Зноў шпіталь, лячэнне, спачатку ў Ташкенце, пасля ў Рызе. За мужнасць і гераізм, праяўленыя падчас Панжэрскай аперацыі, Аляксандр Шынкевіч быў узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі.

Дамоў вярнуўся ў самым канцы 1985 года. Была зіма. З аўтобуснага прыпынку Аляксандр стараўся крочыць па-салдацку, размашыста, але ў армейскіх ботах па коўзкай утаптанай снежнай дарозе асабліва не разгонішся. Сэрца ліхаманкава тухкала ў грудзях: «Я дома!» У двары сустракала матуля. Голаснае «Сыночак, родненькі! Дзякуй Богу, вярнуўся!» абудзіла застылае наваколле вёсачкі Лісіцы. Прытуліўшыся да цёплай мамінай шчакі, Аляксандр адчуваў сябе самым шчаслівым у свеце...

Праз некаторы час (а быў ужо 1986 год), утаймаваўшы боль і адпачыўшы, Аляксандр уладкаваўся на працу ў электрацэх Глыбоцкага малочна-кансервавага камбіната. Так з тае пары і шчыруе тут. Адзін з лепшых і паважаных работнікаў у калектыве. Усё ў жыцці былога воіна-інтэрнацыяналіста Аляксандра Леанідавіча Шынкевіча складваецца найлепшым чынам: дом, сям'я, падрастае, мужае сын, выгадаваў і выдаў замуж дачку, не можа нарадавацца маленькай унучачкай.

– Перажыўшы цяжкія выпрабаванні, асабліва даражыш тым, што маеш, – кажа Аляксандр. – Хораша ў нашым родным краі, на Глыбоччыне. Тут і сонца ласкавейшае, і ветрык лагаднейшы, і людзі вакол добрыя, шчырыя, дружныя, працавітыя. У гэтым і ёсць чалавечае шчасце.

***А. Зінкевіч; фота А. Менжынскай***

*// Веснік Глыбоччыны. — 2014. — 5 лют. — С. 2.*